УДК 811.161.3:81’282.2:392.51

# Трэці дзень вяселля ў лексіцы гаворак Гомельшчыны

К. Л. Хазанава (УА “Гомельскі
дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф.Скарыны”,
Гомель)

**Анатацыя**

У артыкуле даследуецца лексіка, якая выкарыстоўваецца ў гаворках Гомельскага рэгіёна на заключных этапах вясельнай абраднасці. Па структуры гэта адзінкавыя найменні (*куры, пята, цыганы*) або дзеяслоўныя словазлучэнні (*драць курэй, куўшыны лупіць*). Большасць даследаваных назваў паходзіць ад старажытнарускіх каранёў. Прааналізаваная лексіка нясе на сабе адбітак міжмоўнага (у большасці беларуска-рускага) узаемадзеяння, уласцівага гаворкам Гомельшчыны.

**Аннотация**

В статье исследуется лексика, которая используется в говорах Гомельского региона на заключительных этапах свадебной обрядности. По структуре это единичные наименования (*куры, пята, цыганы*) или глагольные словосочетания (*драць курэй, куўшыны лупіць*). Большинство исследованных названий происходит от древнерусских корней. Проанализированная лексика несет на себе след межъязыкового (в основном белорусско-русского) взаимодействия, свойственного говорам Гомельщины.

**Abstract**

In article the lexicon which is used in the last day of wedding ceremonialism in the dialects of the Gomel region is investigated. On structure these words are individual names (*hens, a heel, gipsy*) or verbal word-combinations (*tear up hens, thrash jugs*). The majority of the investigated names occurs from Old Russian roots. The analysed lexicon bears on itself a trace of the interlingual interaction (basically Belarus-Russian) peculiar to the dialects of the Gomel region.

**Ключавыя словы:** абрад, вяселле, гаворка, лексема, лексіка, найменне, семантыка, словазлучэнне, этымалогія.

**Ключевые слова:** говор, лексема, лексика, наименование, обряд, свадьба, семантика, словосочетание, этимология.

**Key words:** ceremony, dialect, etymology, lexeme, lexicon, name, semantics, wedding, word-combination.

Вяселле з’яўляецца адметным мерапрыемствам у жыцці чалавека. Духоўна, матэрыяльна і фізічна пасля вяселля людзі спрадвеку мянялі свой

стан і жыццё. Юнацтва змянялася сталасцю, гарэзлівасць – адказнасцю, летуценнасць – мудрасцю. Відавочна таму вяселле ў кожнага народа суправаджалася разнастайнымі  рытуаламі, дзеяннямі і працэсамі, як ніводная іншая падзея каляндарнага ці абрадавага цыклу.

Не сталі выключэннем у гэтых адносінах і славяне. Заўжды своеасаблівым было вяселле ва ўсходніх славян. У беларускім, рускім і ўкраінскім вяселлі можна вызначыць агульныя і адметныя рысы, большасць з якіх мае старажытнае магічна-рытуальнае паходжанне, абумоўлена даўнімі язычніцкімі і пазнейшымі хрысціянскімі вераваннямі ўсходніх славян і так ці інакш фарміравалася і мянялася пад уплывам роўных аб’ектыўных гістарычна-сацыяльных абставін.

Гомельская вобласць мае незвычайнае геаграфічнае становішча на памежжы тэрытарыяльнага існавання ўсходніх славян. Такія ўмовы паспрыялі аб’яднанаму захаванню ў духоўнай спадчыне Гомельшчыны шматлікіх элементаў, характэрных для традыцый кожнага з усходнеславянскіх народаў. У першую чаргу разнастайныя ўплывы адзначаюцца ў вясельнай абраднасці Гомельскага рэгіёна. Лексіка вясельнай абраднасці Гомеля і вобласці з’яўляецца вельмі цікавай для лінгвістычнага даследавання. Мэтазгодна звярнуць увагу на лексіку гаворак рэгіёна, якія з’яўляюцца сапраўднай скарбніцай грамадскай свядомасці шматлікіх пакаленняў нашых продкаў.

Мэтай артыкула з’яўляецца даследаванне семантычных, структурных і генетычных адметнасцей лексікі, якая выкарыстоўваецца ў гаворках Гомельскага рэгіёна на заключных этапах вясельнай абраднасці

Значнасць вясельнай абраднасці ў жыцці чалавека паўплывала на тое, што гэты абрад, як правіла, праводзіўся на працягу некалькіх дзён (а калі ўлічваць сватанне, то і тыдняў). На кожны дзень менавіта вяселля прызначаліся пэўныя дзеянні і адпаведныя паводзіны. А ў мове захоўваліся адметныя найменні кожнага з іх.

Асаблівасцю вяселля Гомельскага рэгіёна з’яўляецца трэці дзень вяселля. Трэці дзень быў адназначна самым вясёлым этапам вясельнага свята. Ужо закончыліся ўсе афіцыйныя цырымоніі рэгістравання новай сям’і (і дзяржаўныя, і рэлігійныя), ужо бацькі і госці сказалі добрыя словы ў пажаданне дабрабыту маладым, і вось тады пачынаецца весялосць для гасцей.

Часта трэці дзень вяселля прыпадаў на *аўторак*, таму што звычайна вяселле ў старыя часы пачыналася з нядзелі: *Трэці дзень вяселля – апошні дзень вяселля, звычайна* ***аўторак****. “Ва аўторак ужо ходзяць па хатах тых, хто быў на вяселлі, ловяць курэй”* [1, с. 247].

Гаворкі Гомельшчыны захоўваюць адметныя назвы абрадаў трэцяга дня вяселля. Часта сустракаецца найменне *банкеты*:

***Банкеты*** *– гулянне ў гасцей з вяселля на наступныя дні пасля вяселля: на другі дзень .. вяселле працягвалася ўжо не ў хаце маладой і маладога. Усе госці ішлі да хаты хросных бацькоў. Пачаставаўшыся ў іх, ішлі да*

*наступных, хто быў на вяселлі.. Таму* ***банкет*** *мог працягвацца яшчэ цэлы тыдзень* [2, с. 107];

*А на трэці дзень ужэ, на чацвёрты, на пяты з мае стараны (напрымер, я – нявеста) ўжэ сабіраюцца і гаворуць: "Я* ***банкет*** *правяду". І тыя гавораць: "І я правяду"* (в. Старое Сяло) [3].

Слова *банкет* мае яскравае заходнееўрапейскае паходжанне. Усходнеславянскімі мовамі лексема была запазычана з французскай мовы: *banquet* 'урачысты абед з удзелам навуковых, грамадскіх, палітычных дзеячаў, які суправаджаецца прамовамі' [4, с. 89]. Галіцызм замацаваўся ў лексіцы гаворак у выніку пераносу назвы з'явы па падабенству. Слова набыло пэўную стылістычную афарбоўку: іранічнасць і гумар пры метафарызацыі надалі найменню станоўчую ацэначнасць.

На Гомельшчыне вясельныя *банкеты* хутчэй за ўсё *водзяць*:

*А раней – о, былі свадзібы. Па недзелі гулялі!* ***Банкеты вадзілі*** (в. Старое Сяло);

*Пасля вяселля* ***банкеты вадзілі****. Як улетку свадзьба, дык маладых вядуць да калодзежа, вадой паабліваюць. А зімой каталі на санках* [5, с. 286].

Разам з тым сустракаюцца і спалучэнні іншых дзеясловаў з найменнем *банкет*. Так, *банкеты* маглі *дзелаць* і *сабіраць*:

*Сколькі ў каго было родзічаў, яны* ***дзелалі банкеты*** *пасля свадзьбы. Не ўсе, хто быў на свадзьбе, гуляюць, ну прымерна, у таго саседа, патом у таго. Будуць там пяць ці шэсць чалавек, гуляюць усё ўрэмя* (д. Хальч);

*Пасля свадзьбы былі* ***банкеты****. Родственнікі ў канцы свадзьбы дагаворваюцца, калі* ***банкеты сабіраць****. Ад кожнай пары з гасцей павінна быць літра. У гэта васкрасенне мы вас пасадзілі за стол, ў наступнае васкрасенне – вы нас* [2, с. 134].

Адзначым таксама, што традыцыі Гомельскай вобласці захавалі *банкеты нявесціны* і *банкеты жаніховы*:

*На трэцці дзень збіраюць* ***банкеты*** *родзічы* ***водзяць****, сразу* ***нівесціны****, патом* ***жаніховы*** (с. Старое Сяло);

***Жаніховы*** *– раство –* ***банкеты водзяць****, і* ***нявесціны банкеты****. От адні атводзяць нядзелю, а тады тыя нядзелю* (д. Старое Село).

Як паказваюць прыклады, *банкеты* завяршалі вяселле. *Банкеты* маглі быць і на другі, і на трэці, і на чацвёрты дні, і нават працягвацца адзін-два тыдні. Такія доўгатэрміновыя святы мелі на мэце замацаваць добрае, радаснае, шчаслівае жыццё новай маладой сям'і як мага на большы тэрмін. А таксама гэтыя абрады выражалі патрэбнасць людзей у пэўным відовішчы дзеля разнастайнасці іх цяжкага будзённага жыцця. Такія самыя прычыны ляжаць у аснове з'яўлення яшчэ аднаго "мерапрыемства", якое звычайна праводзілася менавіта на трэці дзень вяселля. Прыгадаем вясельныя абрады трэцяга дня, звязаныя з своеасаблівымі пагулянкамі са свойскай птушкай:

*На наступны (трэці) дзень мужчыны, якія былі на вяселлі,* ***убівалі па пятуху ці па куры****, што пад руку пападаюцца, і прыходзілі. Тады гатавалі з кураціны галушкі і вечар гулялі. Так заканчвалася вяселле* [6, с. 116].

Магчыма, абрад захаваўся яшчэ з даўніх часоў язычніцтва і політэізму, калі старажытныя народы ахвярапрынашэннем “задобрывалі” паганскіх багоў.

Падобныя абрадавыя дзеянні звычайна мелі асобныя спецыфічныя найменні. У некаторых мясцовасцях такі звычай называўся адным словам паводле наймення “галоўнай ахвяры”: *куры* – этап вяселля, калі смаляць курэй, звычайна апошні этап:

*Трэці дзень – “**куры**”. “**Куры**” таму, што звычайна падстаўныя маладыя пераапранаюцца, бяруць з сабой “цыган”, ходзяць па дварах – крадуць курэй. Увечары з гэтых курэй вараць суп* [6, с. 122];

***Курэй** – эта напаследак ужэ, **банкет** паследній у каго* (в. Старое Сяло).

Сустракаецца суфіксальнае ўтварэнне ад гэтага самага кораня:

*На трэці дзень была **курыца**. Выбіралі 2-3 чалавека, яны хадзілі па дварах і **сабіралі курэй**, а потым варылі суп і елі* [5, с. 228].

Гомельскія гаворкі захавалі разнастайныя назвы-словазлучэнні гэтага жартаўлівага дзеяння. Часцей фіксуюцца двухслоўныя найменні-вербоіды:

*Трэці дзень называўся “**драць куру**”* (в. Івакі);

*На трэці дзень **дралі курэй**. Перапраналіся хто ў што і шлі па вёсцы. Чыю курыцу забаяць, забівалі. Шлі дамоў і варылі яе* (в. Гарошкаў);

*На третій день **сабіралі кур**: вот те, кто на свадьбе был, с деревні все, хаділі па дварам, сабіралі курэй, тіх курэй засекалі. Скублі іх. Варылі і потом на третій день сабіралісь гуляць. Гаворілі так, што нівеста пакідает радітельскае кубло і уходіт жыть к жыніху* (в. Хальч).

У выпадку наймення падобнага абраду дзеяслоўным словазлучэннем ужываўся дзеяслоў, што абазначаў дзеянні ўдзельнікаў:

***лавіць курэй:** Ва аўторак ужо ходзяць па хатах тых, хто быў на вяселлі, **ловяць курэй*** [1, с. 247]; ***Курэй лавілі**, прывязвалі за нагу ўніз галавой. Параць іх, скубуць. У каструлю клалі тое мяса, прыправу і вараць. А тады і ядзяць. Усю нядзелю гулялі калісь* (в. Заспа);

***красці курэй:** Пасля вяселля, раніцай у панядзелак, госці ходзяць па дварам, **крадуць курэй**. Тады іх вараць, ставяць на стол* ([7, с. 163]; *Трэці дзень – “куры”. “Куры” таму, што звычайна падстаўныя маладыя пераапранаюцца, бяруць з сабой “цыган”, ходзяць па дварах – **крадуць курэй**. Увечары з гэтых курэй вараць суп* [6, с. 122];

***круціць курэй:** Старых надзяюць маладой. І ідуць ужэ, пяюць, **курэй круцяць**, што толькі не выдумляюць* (в. Гарошкаў).

Для наймення абраду выкарыстоўваўся і аддзеяслоўны назоўнік:

*На трэці дзень было **прыгатаванне курэй.** На ўсёй дзярэўні ў тых людзей, што булі на свадзьбе* [1 Лоеўшчына, с. 233].

Гэты вясельны абрад на Гомельшчыне фіксуецца і з іншымі назвамі, словамі, утворанымі ад іншых каранёў. Сустракаецца, напрыклад, лексема *карэнне*:

*Апошні дзень вяселля – **карэнне**. Усе госці збіраліся ў маладой. Пасярод двору ў маладой раскладвалі вогнішча, ставілі чугун. Пераапранутыя госці лавілі курыцу, абдзіралі яе ў чугуне. Пер’е жанчыны кідалі на голавы мужчынам* [2, с. 107].

Хаця лексема на першы погляд не з’яўляецца роднаснай словам *кура*, *курыца* і не звязана з коранем *кур-*, хутчэй за ўсё найменне з’явілася ў выніку блытаніны паводле блізкага гучання паміж назоўнікамі-паронімамі *куры – курэнне – карэнне*. Указаная лексема часам ужываецца ў словазлучэнні з тымі самымі дзеясловамі, што і словаформы *куры, курэй*:

*Канчаецца свадзьба – **карэнне драць**. Надзяю штаны, надзяю лапці, дзелаю сабе горб на плячах, бараду прышчаплю, шапку выварочваю і пайшла курэй лавіць* [5, с. 234].

Неабходна ўспомніць таксама іншыя найменні абраду, якія адбываліся на трэці дзень вяселля (дакладней – на апошні дзень):

***галоўні: Галоўні**. – трэці дзень вяселля, калі збіраюць курэй у людзей, якія ўдзельнічалі ў вяселлі* [1, с. 243]. Відавочна этымалагічная сувязь назвы з лексемай *галава*. Паходжанне наймення здаецца верагодным шукаць у вытворнасці ад старажытнарускага *голованити* ‘рубіць галаву жывёле ці птушцы, напрыклад, індычцы’ [8, с. 368];

***пята:** Два дні гулялі свадзьбу, на трэці дзень – **Пята.** На трэці дзень ета самае. Чудовішчэ. Ужо перадзяемся. Напрымер, паймаюць пеўня, а не, так і два. У нявесты адно есці і ў жаніха. Яшчэ й гарэлкай паілі етага пятуха. Красны бант сюды на ікшыцы завяжуць. Убяруць ужо пятуха тога. І за аборачку ўжо зачэпіш* [5, с. 242]. Найменне паходзіць ад назвы пеўня, што захавалася ў рускай мове – *петух*. Такая сувязь адлюстроўвае міжмоўнае ўзаемадзеянне, што адзначаецца ў гаворках Гомельшчыны ў выніку цэнтральнага месцазнаходжання паміж іншымі ўсходнеславянскімі гаворкамі.

Спецыфічным найменнем у вясельнай лексіцы Гомельскага рэгіёна з’яўляецца лексема *пярэзвы*. Слова ўжываецца і ў форме адзіночнага, і ў форме множнага ліку:

***Перазоў**, -у, м., **пярэзвы**. Вясельны абрад: бацькі маладой пасля першай вясельнай ночы ідуць гасцяваць у хату бацькоў жаніха. “Розсунь, свату, хату, бо велікій **перезов** маю”* [9, с. 234];

*У гэты дзень вадзілі “**пярэзвы**”: збіраліся радня маладога і маладой і паасобку хадзілі да сваёй радні з хаты ў хаты. Бралі курыцу і няслі яе ў край сяла, з песнямі. Там гэту курыцу скублі, смалілі* (в. Івакі);

***Пярэзвы** – абрад, які выконваўся на чацвёрты дзень вяселля. “Кросны запрашае да сябе, потым кросная запрашае да сябе. На пярэзвы смаляць курэй і носяць іх на палках, што нявеста чэсная”* [10, с. 247];

*Пасля свадзьбы, у нядзелю, родственнікі жаніха назначылі час, калі да іх далжны былі прыйсці самыя блізкія родственнікі для гульні ў **пярэзвы**. У іх гулялі, то ў свата, то ў сястры на працягу двух нядзель. На гэтую гульню аддзяваліся ў розныя плацці для смеху. Так завяршаецца свадзьба* [11, с. 179];

*Даждаўшы наступнай суботы пасля вяселля бацькі маладой звалі дачку з зяцем і са сватамі к сабе ў госці.. А яшчэ цераз нядзелю, таксама ў суботу, ужо бацькі маладога рабілі **пярэзвы**. І на гэтым ужо вяселле заканчваецца* [2, с. 43].

Як сведчаць прыклады, *пярэзвы* праводзіліся на трэці ці чацвёрты дні вяселля. У выпадку, калі святкаванне вяселля працягвалася тыдзень або два, *пярэзвы* адбываліся ў выхадныя дні праз тыдзень пасля вяселля. Але ўсе звесткі аднолькавыя ў тым, што *пярэзвы* з’яўляюцца заключным этапам вясельнай абраднасці. Найменне вызначаецца цікавым паходжаннем. Лексема ўзыходзіць ад дзеяслова *зъвати* ‘клікаць. запрашаць’. Госці, блізкія родзічы маладых, запрошаныя на вяселле, у сваю чаргу запрашалі (зноў запрашалі, перазапрашалі) гаспадароў вяселля да сябе.

Яшчэ адным адметным дзеяннем, якое суправаджала вяселле на Гомельшчыне, было пераапрананне. Гэтыя мерапрыемствы таксама звычайна праводзіліся напрыканцы вяселля, у апошні, трэці ці чацвёрты, дзень свята і суправаджала абрад з курамі:

*Увечары ўсе збіраюцца, і вяселле працягваецца. Некаторыя людзі **задзелываюцца** пагана: жэншчына ў мужчыну, мужчына ў жэншчыну, прыходзяць летам на каньках, зімой – босыя, каб смешна было* [1, с. 243];

*На трэці дзень дралі курэй. **Перапраналіся** хто ў што і шлі па вёсцы. Чыю курыцу забаяць, забівалі. Шлі дамоў і варылі яе* (в. Гарошкаў).

Абрад пераапранання захаваўся пад назвай *цыганы*. Такое найменне, відаць, абумоўлена тым, што апраналіся ў што-небудзь яркае, бліскучае, “каб смешна было”, а такія асаблівасці вопраткі і спецыфіка адзення народнай традыцыяй прыпісваецца менавіта прадстаўнікам гэтай нацыянальнасці, як, дарэчы, і “схільнасць” да крадзяжоў:

***Цыганы** – абрад пераапранання ў цыган. Адзначаўся на другі дзень вяселля. “**Пераапраналіся ў цыган**. Мужыкі пераапраналіся ў жаночую вопратку, а жанчыны – у мужчынскую. Хадзілі па хатах, кралі курэй, збіралі яду. Было такое, што залязалі на стол, кралі ў нявесты туфелькі, прыходзілася жаніху дарыць падаркі цыганам, каб выкупіць туфелькі”* [10, с. 192].

Як і ў папярэдніх выпадках, гаворкі адлюстроўваць найменне абраду праз словазлучэнне *пераапранацца ў цыган, хадзіць у цыганы*:

*На трэці дзень “**хадзілі ў цыганы**”. Жэншчыны паадзяюцца ў мужское, а мужчыны – у жэнскае, паўмазваюцца, паўкрасваюцца. І вот, ідуць па дзярэўне. Ідуць, дзе бяжыць курыца, яны тую курыцу “хлоп!”, да ўб’юць яе, да ў торбу. Прыташчылі етае к маладому ці к маладой. І гэтае зноў гатавалі* [6, с. 121].

Звернем увагу на той факт, што ўказаныя абрады адбываліся ўсе разам, адначасова, суправаджалі адзін аднаго:

*Трэці дзень – “**куры**”. “Куры” таму, што звычайна **падстаўныя маладыя** пераапранаюцца, бяруць з сабой “**цыган**”, ходзяць па дварах – **крадуць курэй**. Увечары з гэтых курэй вараць суп* [6 Нар. Дух. культ. Браг-ны, с. 122].

На трэці дзень вяселля не толькі звярталі ўвагу на курэй або пераапраналіся. Таксама ўспаміналі аб тым, што пасля вяселля ў маладой сям’і трэба чакаць папаўнення, дзіця, а для гэтага неабходна маладой мець

здароўе і перш за ўсё моцны жывот. Адсюль – яшчэ адзін звычай трэцяга дня, звязаны з посудам:

*На трэцці дзень па вуліцы ідуць, пярадзяюцца: у штаны бабы, усякае! А калісь, як памыюць пасуду –* ***кушыны****, на забор* ***павешаюць****. Шчас нік-нік-нік. Кушыны вісяць! Шчас пойдуць, нівесту схвацяць і на жываце* ***кушыны*** *тыя* ***лупяць****, каб крэпкі жывот быў. Ваду, хто нісе, паразліваюць. Старых парадзівалі ў маладых* (в. Старое Сяло);

*Парадзяюцца: бабы, і старэйшыя, і ўсякія і ў шуткі вываричуюць, і штаны бабы надзяюць як мужчыны, і картузы: ідуць. Гармоні іграюць, песні пяюць, танцуюць. Людзі ўжо: "Ладна. Банкеты ж водзяці!"* ***Кушыны*** *на заборы* ***вісяць****, а то не паспееш убраць – кушыны палкай. І нявесту за рукі, за ногі, распластаюць і на жываце* ***кушыны лупяць****, шоб жывот быў крэпкі. Красіва тады гулялі* (в. Старое Сяло).

Заўважым, што для назвы гэтага абраду ў гаворках Гомельшчыны выкарыстоўваецца лексема *кушын*, што з'яўляецца фанетычным варыянтам слова рускай мовы *кувшин* 'збан'.

Разгледжаная лексіка трэцяга дня вясельнай абраднасці Гомельскага рэгіёна сведчыць аб старажытнасці найменняў, як і адпаведных дзеянняў. Гэтыя абрады ў сваёй аснове маюць сувязь са старажытнымі магічнымі рытуаламі. Апошнія дні вяселля адрозніваліся большай весялосцю, смяшлівасцю. Стомленыя штодзённай цяжкай працай і ўзбуджаныя нервовасцю падрыхтоўкі да вяселля ў трэці ці нават чацвёрты дзень і гаспадары, і госці імкнуліся зрабіць сапраўдныя пагулянкі.

Лексіка гэтых абрадаў уяўляе сабой адметную моўную з'яву. Па структуры гэта адзінкавыя найменні (*куры, пята, цыганы*) або дзеяслоўныя словазлучэнні (*драць курэй, куўшыны лупіць*). Назоўнікавыя словазлучэнні фіксуюцца ў адзінкавым выпадках (*прыгатаванне курэй*). Большасць даследаваных назваў мае яскравае паходжанне ад старажытнарускіх каранёў. Лексіка, што адзначаецца ў Гомельскіх гаворках у вясельных абрадах трэцяга дня, нясе на сабе адбітак міжмоўнага (у большасці беларуска-рускага) узаемадзеяння, уласцівага гаворкам Гомельшчыны.

1 Лоеўшчына.. Бэзавы рай, песенны край: сучасны стан традыцыйнай культуры Лоеўшчыны / уклад. В. С. Новак. – Гомель: Сож, 2007. – 472 с.

2 Вяселле на Гомельшчыне: фальклорна-этнаграфічны зборнік / рэд. І. Ф. Штэйнер, В. С. Новак. - Мінск: ЛМФ "Нёман", 2003. – 472 с.

3 Прыводзіцца фактычны матэрыял картатэкі лінгвістычнай лабараторыі кафедры беларускай мовы УА "Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны" з указаннем у дужках лакалізацыі. Ілюстрацыі прыводзяцца з захаваннем фанетычных і граматычных адметнасцей мясцовага вымаўлення.

4 Словарь иностранных слов / под ред. И В. Лёхина, Ф. Н. Петрова. – М.: Государственное издательство иностранных и национальных словарей, 1949. – 800 с.

5 Вечнае: Фальклорна-этнаграфічная спадчына Веткаўскага раёна / уклад. І. Ф. Штэйнер, В. С. Новак. – Гомель: УА “ГДУ імя Ф. Скарыны”, 2003. – 362 с.

6 Народная духоўная культура Брагіншчыны: фальклорна-этнаграфічны зборнік / склад. В. С. Новак, У. І. Коваль. – Гомель: Белдрук, 2007. – 240 с.

7 Фальклорна-этнаграфічная і літаратурная спадчына Рэчыцкага раёна / уклад. І. Ф. Штэйнер, В. С. Новак. – Мінск: ЛМФ “Нёман”, 2002. – 384 с.

8 Даль, Владимир. Толковый словарь живого великорусского языка: в 4 т. / Владимир Даль. Т. 1: А – З. – М.: Русский язык, 1978. – 699 с.

9 Фальклорны слоўнік Гомельшчыны / У. В. Анічэнка [і інш.]. – Гомель: УА “ГДУ імя Ф. Скарыны”, 2003. – 346 с.

10 Жаўруковая песня Радзімы: народныя духоўныя скарбы Буда-Кашалёўскага краю / пад аг. рэд. В. С. Новак. – Гомель: Сож, 2008. – 424 с.

11 Народная духоўная спадчына Гомельскага раёна / уклад. В. С. Новак. – Гомель: ААТ “Полеспечать”, 2007. – 456 с.